


# КНІГА ДА СВЯТА ПЕРАМОГІ

**Выйшаў з друку чарговы зборнік лірыкі, аўтар якога член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт з Ваўкавышчыны Мікалай Іваноўскі. Новы зборнік пад назвай «Адгалоскі саракавых» тэматычны, – прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне *(Мінск, «Ковчег», 2024).***

Як сказана ў анатацыі да выдання, новы зборнік лірыкі Мікалая Іваноўскага складаецца з пяці раздзелаў: «Вайна – страшэнная пачвара»; «Сляза Перамогі»; «Не змые памяць»; «Абеліскі»; «Незалежнасць, мір, свабода». Кніга прысвячаецца двум слаўным юбілеям з нашай гісторыі – 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Кніга рэкамендуецца дарослым чытачам, а таксама дзецям старэйшага школьнага ўзросту. Наклад 100 асобнікаў. Пераплёт цвёрды. Рэдактары Інга Вінарская і Вячаслаў Корбут. Часткай зместу зборніка стала падборка фотаздымкаў, на якіх аўтар кнігі ў кампаніі сваіх сяброў падчас наведвання мемарыялаў Вялікай Айчыннай на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. На тыльным баку вокладкі чытачу прапануецца творчая біяграфія паэта.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

# МІРНАГА НЕБА ВАМ, ЛЮДЗІ…

Калі дажыў да сівізны, значыць, прыйшоў час азірнуцца назад, перабраць у памяці пройдзенае, набытае, згубленае… Што наперадзе, болей-меней вядома, калі жыццё праходзіць пад Мірным Небам. Але, але, але… У апошні час на Зямельцы шмат гора, слёз, бед. Страшна за нашых дзяцей і ўнукаў: якая будучыня чакае іх наперадзе, за даляглядам?.. Мы – дзеці саракавых і пазней гадоў. І дзякуй Богу, што не зведалі мы жудаснай вайны. А цяпер?..

Ваенныя падзеі 1941-1945 гадоў былі і навекі застануцца ў сэрцах пакаленняў нас, беларусаў: тут кожнага трэцяга забрала вайна, а колькі калек, сірот, удоў… Тысячы абеліскаў, і на кожным імёны, імёны, імёны…

Не абыйшла бокам вайна і наш род, род Іваноўскіх-Лявусікаў. Мой дзед, бальшавік-падпольшчык у Заходняй Беларусі Мікалай Хведаравіч Іваноўскі

расстраляны ў свае сорак восем гадоў у 1942 годзе ў Крынках (Польшча). Загінуў ад бомбы ля Варшавы матулін брат Пётр Іванавіч Лявусік. Трапіў у палон і ўсю вайну працаваў у канцлагеры другі матулін брат Іван Іванавіч Лявусік. Была вывезена ў рабства ў Германію сястра мамы Зінаіда Іванаўна Лявусік. І гэты спіс можна прадаўжаць імёнамі радні, сваякоў, суседзяў-аднавяскоўцаў, проста знаёмых…

Сваю новую кнігу вершаў «Адгалоскі саракавых» я прысвячаю памяці тых, каго няма сярод нас ад часоў Вялікай Айчыннай, і тым, хто цяпер захоўвае памяць і стараецца цёплым слоўцам і справай увекавечыць памяць трагічных часоў-падзей. Вельмі кранаюць падзеі нашых суседзяў, сягонняшнія дні, погляды чалавека, які іншым вокам, вокам дабрыні і ласкі бачыць усё гнілоцце вайны, разрухі, енк матуль і дзяцей, маладых хлапцоў-салдат, якіх не шкадуе смерць, хоць яна нікога і ніколі не шкадуе… Прыкра забываць гісторыю сваіх каранёў, за што аддалі свае жыцці нашы продкі, калі жылі братамі, сябрамі, добрымі суседзямі. Заклікаю сваімі вершамі яшчэ хвілінку падумаць, паразважаць, уцяміць, вярнуць памяці ўсё добрае, цёплае, што было і што пакінем нашчадкам.

Ужо амаль восемдзесят гадоў прайшло пасля Вялікай Айчыннай вайны… Слова «Перамога» – слова радасці «са слязою на вачах», а слова «вайна» палохае нашыя сэрцы, але не схавае, не закрые сваёй смяротнай хмарай Мір, Дабрыню, Цеплыню.

**З павагай,**
**аўтар Мікалай Іваноўскі**